# Грунвальдская бітва 1410 г.

Вершаваная аповесць 1582 г.

Словы Мацея Стрыйкоўскага




Слаўлю адвагу, ваяроў сармацкіх
Што пасеклі ў бітве рыцараў крыжацкіх

Меўся ордэн ўсю Літву з Польшчай зруйнаваці
Прагнуў права сваё нам гвалтам навязаці

Таму варта хутка на вайну збірацца,
Каб на прускіх землях з ворагам спаткацца

Гвалт крыжацкі супыніць ды уласнай сілай
Славу-волю нам здабыць для Айчыны мілай

Войскі ўсе выйшлі і хутчэй памчалі
Ды ля Грунэвальда станы пастаўлялі

Нашы Багародзіцу, немцы Dasticht завялі
Ды з гарматаў грукат-трэск гучна распачалі

Так літвіны смела з крыкамі нясуцца
А пад імі коні бакамі б'юцца

Смела з літвай Вітаўт рэй вядзе-трымае
І натхняе крыкам, шэрагі раўняе

Шалёна, мужна з гуфам гуф сячэцца
Як мядзведзь раз'юшаны, што на злом нясецца

Твар да твару сеча йдзе, немцы нас змагаюць
А ж літва з татарамі з лукаў іх накрываюць

*Страшны хруст, звон, грукат, гром ідзе ад зброі*
*Горлы ў крыку лютым пазрывалі воі*

*Шум і звон ад зброі далятае страшна,*
*Сонца ў небе плыве залаціста-ясна*

*Прускіх дзесяць комтураў там важнейшых легла*
*Кроў струменем ліецца, немчура пабегла*

*Нашы колюць, рэжуць, б'юць, волю зброі даўшы*
*Ды палоняць комтураў, рукі ім звязаўшы*

*Дзідамі там немцаў, у хрыбты калолі*
*Ды вантробы люта ім з жыватоў паролі*

*Нашы моцна, смела гуф нямецкі білі*
*Як ваўкі пад кустам, кнехты галасілі*

*Колькі міль за ворагам нашы воі мчалі*
*Немцы леглі, як трава зброю пакідалі*

---

*Хутка вестку добрую нашы людзі мелі*
*І паветра і зямля ад імшы дрыжэлі*

*Ўдзячна па касцёлах Te deum завялі*
*І ў Літве і ў Польшчы Бога праслаўлялі.*